В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

## Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Прыслоўе як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае значэнне** | Абазначае → прымету дзеяння: працаваць (як?) старанна<br>→ прымету прадмета: чытанне (якое?) услых<br>→ прымету прыметы: зусім (у якой меры?) малы |
| **Марфалагічныя прыметы** | Не скланяецца, не спрагаецца, не змяняецца па родах і ліках, з'яўляецца нязменным. Але многія якасныя прыслоўі маюць ступені параўнання (смела — смялей) |
| **Сінтаксічная роля** | Часцей за ўсё — акалічнасць: Імкліва праплываюць хмаркі.<br>Радзей — азначэнне: Насцярожыла размова па-нямецку. |

© ТДА «Аверсэв»

# Разрады прыслоўяў паводле значэння

| Разрад | Пытанні | Словы | Сказы |
|---|---|---|---|
| | | Азначальныя | |
| якасныя | як? | весела, добра, смела, горача, зелена, шчодра | Шчодра цвіў гэтай вясною сад. |
| колькасныя | колькі? як многа? у якой ступені? | вельмі, дужа, занадта, чуць, утройчы, амаль, мала, спрэс | Час быў дужа трывожны. |
| спосабу дзеяння | як? якім чынам? | бягом, моўчкі, пехатой, уброд, пабеларуску | І вось наш дзядзька едзе зайцам. |
| | | Акалічнасныя | |
| месца | дзе? куды? адкуль? | усюды, здалёк, уверсе, тут, побач, сюды, даверху | Гляджу на былое здалёк. |
| часу | калі? з якога часу? да якога часу? як доўга? | сёння, заўтра, раніцай, удзень, цяпер, даўно, спрадвеку, увосень, вечна | Вечна я ўдзячны жытняму полю. |
| прычыны | чаму? па якой прычыне? | завошта, згарача, спрасонку, штосьці, чамусьці, навошта, таму, сослепу | Спрасонку Стас бег на зарадку. |
| мэты | для чаго? з якой мэтай? | знарок, нарокам, знячэўку, наперакор, сумыслу | Васіль знарок не пайшоў у кіно. |



© ТДА «Аверсэв»

# Ступені параўнання якасных прыслоўяў

| Зыходная форма | Вышэйшая ступень | | Найвышэйшая ступень | |
|---|---|---|---|---|
| | Простая форма | Складаная форма | Простая форма | Складаная форма |
| дорага<br>смела<br>ярка<br>(многа, добра, дрэнна, мала) | утваральная аснова + -ей (-эй, -ай):<br>дорага + эй → даражэй,<br>смела + ей → смялей;<br>суплетыўныя формы:<br>многа → больш (болей),<br>добра → лепш (лепей) | больш (болей), лепш (лепей) + зыходная форма:<br>больш дорага,<br>больш ярка,<br>менш ярка,<br>больш выразна,<br>менш гучна | най + форма вышэйшай ступені:<br>най + даражэй → найдаражэй,<br>най + смялей → найсмялей,<br>най + больш → найбольш | найбольш (найболей), найменш (найменей) + зыходная форма:<br>найбольш дорага,<br>найменш ярка,<br>надзвычай добра,<br>лепш за ўсіх |



© ТДА «Аверсэв»

# Спосабы ўтварэння прыслоўяў

| Спосаб утварэння | Утваральная аснова ці слова | Словаўтваральны сродак | Вытворнае слова |
|---|---|---|---|
| Суфіксальны | раніца<br>бегчы<br>ціха | раніц + ай<br>бег + ма<br>ціх + усенька | раніцай<br>бегма<br>ціхусенька |
| Прыставачны (прэфіксальны) | высока<br>воддаль | за + высока<br>на + воддаль | завысока<br>наводдаль |
| Прыставачна-суфіксальны | хата<br>век<br>беларускі<br>ваш<br>упыніць | да + хат + ы<br>ад + век + у<br>па + беларуск + у<br>па + ваш + аму<br>без + упын + ку | дахаты<br>адвеку<br>па-беларуску<br>па-вашаму<br>безупынку |
| Складанне | дзе, нідзе<br>што, месяц<br>напаў (г. зн. напалову)<br>сур'ёзна | дзе + нідзе<br>што + месяц<br>напаў + сур'ёзна | дзе-нідзе<br>штомесяц<br>напаў-сур'ёзна |
| Складана-суфіксальны | міма, лётаць<br>што, мінута | міма + лёт + ам<br>што + мінут + ы | мімалётам<br>штомінуты |



© ТДА «Аверсэв»

# Правапіс прыслоўяў

| Разам | Праз злучок | Асобна |
|---|---|---|
| Прыслоўі, утвораныя:<br>1. + прыслоўе: назаўсёды, назаўжды, напасля, напотым, назусім, заўчора, пазалетась, замнога і пад.<br>2. на-, у- + зборныя і колькасныя лічэбнікі (розныя формы): надвае, натрае, удвая, утрая, удваіх, упяцярых, удвух, учатырох і да т. п.;<br>**але:** у адно, па двое, па трое і пад.<br>3. + кароткія прыметнікі (розныя формы): дабяла, дасыта, здалёк, зрэдку, справа, сослепу, змалку, бязмала, паціху, улева, навечна, насуха, зажыва і пад., а таксама заадно.<br>4. + поўныя прыметнікі (не пачын. з галосн.), займеннікі (розныя формы): урассыпную, ушчыльную, зменшага, здаўных, навошта, нізашто, потым, зусім, ваўсю.<br>5. + назоўнік (розныя формы): апоўдні, наадрэз, напракат, уголас, наўдачу, пакрысе, паняволі, увосень | 1. Прыслоўі з прыстаўкай па-, якія канчаюцца на:<br>-і (-ы): па-латыні, па-чалавечы;<br>-аму (-яму): па-нашаму, па-вясенняму;<br>-ку: па-ўкраінску;<br>-ому (-ему, -йму): па-старому, па-мойму.<br>2. Прыслоўі з прыстаўкай па-, утвораныя ад парадкавых лічэбнікаў: па-першае, па-другое і г. д.<br>3. Прыслоўі з прыстаўкай абы- і постфіксам -небудзь: абы-дзе, калі-небудзь.<br>4. Утвораныя шляхам спалучэння двух прыслоўяў: як-ніяк, дзе-нідзе, далёка-далёка, воляй-няволяй, калі-нікалі | 1. Спалучэнні тыпу «прыназоўнік + назоўнік», калі:<br>а) паміж прыназоўнікам і назоўнікам можна ўставіць азначэнне: у момант (у той момант), у тупік (у самы тупік);<br>б) назоўнік захаваў некаторыя склонавыя формы: да часу, з часам, па часе, у час; на памяць, па памяці; да пары, у пару.<br>2. Прыназоўнік у + назоўнік, які пачынаецца з галоснай (не о, у): у абдымку, у адзіночку, у абрэз, у абцяжку;<br>без + назоўнік: без аглядкі, без упынку, без разбору, без канца;<br>**але:** бясконца;<br>да + назоўнік: да ўпаду, да адвалу;<br>на + назоўнік: на бягу, на ляту, на скаку, на віду, на вока, на дзіва, на гвалт, на смех, на жаль, на злосць;<br>з + назоўнік: з разбегу, з гарачкі, з ходу, з размаху |



© ТДА «Аверсэв»

# Правапіс НЕ (НЯ), НІ з прыслоўямі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| 1. Прыслоўе без не (ня) не ўжываецца: неўзаметку, нехаця, няўцешна, нязгасна.<br>2. Прыслоўе з не (ня) можна замяніць сінонімам без не (ня): недалёка (г. зн. блізка), нясмела (г. зн. баязліва).<br>3. Калі на не падае націск: не́дзе, не́калі, не́куды, не́як, не́адкуль | 1. У сказе ёсць ці падразумяваецца супрацьпастаўленне: Дый я любіла яе не проста як старшую (У. Карпаў).<br>2. З узмацняльнымі прыслоўямі: не вельмі, не зусім, не надта.<br>3. З нязменнымі словамі-выказнікамі: Не варта гэта рабіць. Не трэба спяшацца. |
| Ні ў адмоўных прыслоўях не пад націскам: нікóлі, нідзé, нікýды, ніадкýль, нічýць, нія́к, нікóлькі, нізаштó, нізвáння | Ва ўсіх іншых выпадках: ні ўзад, ні ўперад; ні так, ні гэтак; ні адтуль, ні адсюль |

# Марфалагічны разбор прыслоўя

## Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Марфалагічныя прыметы: нязменнае слова, разрад паводле значэння, ступень параўнання (калі ёсць).
3. Сінтаксічная роля.

## Узор разбору

Шырай, шырай заранiца разнімае крылле (Я. Колас).

*Шырай* — прыслоўе, абазначае прымету дзеяння: (разнімае як?) *шырай*; нязменнае слова, азначальнае, якаснае, ужыта ў вышэйшай ступені параўнання; утворана ад прыслоўя *шырока* суфіксальным спосабам (суфікс -ай).

У сказе з'яўляецца акалічнасцю.



© ТДА «Аверсэв»